Надвор'е

# НАС «ЮРГЕН» АСТУДЗІЦЬ

**Праўда, пахаладанне будзе нядоўгае. У суботу–нядзелю — ужо да плюс 17**

Халодны шырокі антыцыклон, які нямецкія метэаролагі назвалі «Юргенам», фарміраваў надвор'е ў большасці краін Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі. Яго цэнтр ужо наблізіўся да нашых межаў. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак па краіне была 4–8 градусаў марозу, на метэастанцыі Бабруйск — мінус 10 градусаў. А істотна пацяплее ў нас толькі ў канцы гэтага тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Пакуль жа на працягу гэтага тыдня надвор'е застанецца пад уплывам антыцыклону. Калі цэнтр яго перамесціцца на еўрапейскую частку Расіі, разам з ім сыдзе і арктычны холад, а Беларусь апынецца на яго цяплейшай заходняй ускраіне. У сераду будзе малавоблачна і без ападкаў. Вецер прагназуецца слабы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да мінус 10 градусаў, месцамі — да 11–13 марозу. Удзень будзе 5–10 цяпла.

Чакаецца невялікая воблачнасць без ападкаў і ў чацвер. Вецер пераменных напрамкаў, слабы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, месцамі — да 10 марозу. Удзень — ад плюс 8 да плюс 13 градусаў. Крайні дзень начнога марознага холаду чакаецца ў пятніцу. Будзе невялікая воблачнасць, пераважна без ападкаў. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Уначы — ад мінус 1 да мінус 6 градусаў, па паўночным усходзе — да мінус 7 — мінус 9 градусаў. А вось удзень стане камфортна — 10–15 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу без ападкаў. Вецер — паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, пры праясненнях — да 6 марозу. Удзень будзе трымацца ад плюс 11 градусаў да плюс 17 градусаў. Сонечнае надвор'е без ападкаў чакаецца і ў нядзелю. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — ад плюс 12 да плюс 17 градусаў. Вясна!

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК І КАЛІ ЭКАНОМІЦЬ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дадатковая дыферэнцыяцыя тарыфаў (з 1 студзеня 2020-га) дазваляе людзям, зыходзячы са сваіх звычак і ладу жыцця, самім выбраць тую тарыфную сістэму, якая дасць магчымасць мінімізаваць расходы на электраэнергію, заўважыў **Віктар ЖЫТКЕВІЧ, начальнік упраўлення збыту энергіі Белэнерга.**

Да 2023 года Белэнерга мяркуе за свой кошт мадэрнізаваць усе прыборы ўліку электраэнергіі шляхам замены індукцыйных лічыльнікаў новымі электроннымі. Цяпер з 4,6 мільёна лічыльнікаў электраэнергіі ў краіне 60 % ужо электронныя, а індукцыйныя забаронены для ўстаноўкі — пры новым будаўніцтве ці капрамонце ўсталёўваюць ужо толькі электралічыльнікі.

### Тарыфы на электраэнергію падзяляюцца на наступныя катэгорыі

1. Аднаставачны тарыф на электраэнергію ў дамах і кватэрах, якія абсталяваны электрычнымі плітамі, складае 16,16 капейкі за 1 кВт·г. Двухзонны тарыф для гэтай катэгорыі дапускае мінімальны памер з 22 гадзін ночы да 17 гадзін наступнага дня — 11,31 капейкі, а ў час максімальных нагрузак з 17 да 22 гадзін утрая вышэйшы — 32,32 капейкі. Жыхары дамоў з электраплітамі могуць разлічвацца таксама па трохзонных тарыфах: з 23 гадзін ночы да 6 раніцы электраэнергія будзе каштаваць 9,7 капейкі, пры максімальнай нагрузцы з 17 вечара да 22.00 — 29,09 капейкі. У астатні час сутак — з 6 раніцы да 17 вечара — 11,31 капейкі.

2. Другая група тарыфаў прадугледжана для людзей, якія выкарыстоўваюць электраэнергію для ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай (сумарнай) магутнасцю электранагравальніка, большай за 5 кВт. За электраэнергію для абагрэву і ацяплення ў гэтай катэгорыі можна плаціць па двухзонным тарыфе. У час мінімальных нагрузак з 23 ночы да 6 раніцы — 11,09 капейкі, а з 6 раніцы да 23 ночы — 20,59 капейкі.

3. У дамах і кватэрах, дзе ўсталяваны электрапліты, аднак адсутнічаюць сістэмы цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння, а таксама няма асобнага (дадатковага) прыбора ўліку расходавання электраэнергіі на ацяпленне і падагрэў вады, з гэтага года дзейнічаюць сезонныя тарыфы. З 1 студзеня да 31 мая аднаставачны тарыф складае 8,09 капейкі, а з 1 чэрвеня да 31 снежня — 8,34 капейкі. Гэтыя сумы можна таксама выплачваць па двухзонных тарыфах згодна з часам. Да лета з 23 да 6 гадзін гэта будзе 5,66 капейкі, а ў астатні час сутак — 10,52 капейкі.



А вось з 1 чэрвеня цана падымецца з 23 ночы да 6 раніцы да 5,84 капейкі, а ў іншыя гадзіны — да 10,84 капейкі.

4. У дамах, дзе адсутнічае цэнтралізаванае цепла- газа- і гарачае водазабеспячэнне, — ёсць асобны (дадатковы) прыбор індывідуальнага ўліку расходу энергіі на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне, тарыф на электраэнергію таксама сезонны. З 1 студзеня да 31 мая — 3,35 капейкі за 1 кВт·г, а з 1 чэрвеня да 31 студзеня — 3,74.

— Гэтая тарыфная група вельмі прывабная, але трэба разумець, што яна — для індывідуальнай забудовы, дзе ў дамах няма газа- і водаправоду, цэнтральнага ацяплення, — падкрэсліў Віктар Жыткевіч. — Калі чалавек хоча выкарыстоўваць электраэнергію для падагрэву вады, яму трэба ўсталяваць асобны прыбор уліку энергіі, якая расходуецца на гэтыя мэты. У тым жа доме электраэнергія, затрачаная для ацяплення і на работу бытавой тэхнікі, разлічваецца па іншым прыборы ўліку.

5. Аднаставачны тарыф на электраэнергію ў дамах з газавымі плітамі — 19,01 капейкі. У гэтай катэгорыі электрычнасць можна аплачваць па двухзонным тарыфе: з 22 да 17 — 13,31 капейкі, з 17 да 22 — 38,02 капейкі. А можна па трохзонным: з 23 да 6 — 11,41 капейкі, з 17 да 23 — 34,22, у астатні час — 13,31 капейкі (гэта большасць абанентаў).

### Памяняць тарыф бясплатна і за грошы

Калі чалавек пераходзіць на двух- або трохзонныя тарыфы, то ў выхадныя і святочныя дні на працягу сутак для яго дзейнічае мінімальная цана на электраэнергію. Высветліць, наколькі выгадна пераходзіць на пэўны тарыф, можна толькі вопытным шляхам, аднак ужо цяпер можна казаць, што чым больш энергіі выкарыстоўваеш, тым больш можна сэканоміць на яе аплаце, упэўнены спецыялісты.

Калі б чалавек, які за месяц траціць 500–600 кВт·г (у прыватным доме), перайшоў з аднаставачнай сістэмы на трохзонны тарыф, ён бы змог сэканоміць да 15,5 рубля ў студзені. А пры выкарыстанні каля 100 кВт·г у месяц такі ж пераход прынясе выгаду 3–4 рублі. «Калі пры гэтым яшчэ памяняць звычкі і перавесці хатнія энергазатратныя работы на выхадныя, то можна дасягнуць яшчэ большай эканоміі», — дадаў эксперт.

Перайсці на іншую сістэму аплаты можна толькі пры наяўнасці электроннага лічыльніка. Пры гэтым першы пераход будзе бясплатны, а вось вярнуцца да папярэдняй сістэмы можна толькі за грошы.

**Ірына СІДАРОК.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## 50 рублёў цяпер «пяцьдзясят»

Праўда, банкноты з надпісам «пяцьдзесят» будуць хадзіць паралельна, пакуль не зносяцца

**Абноўленыя банкноты наміналам 20 і 50 беларускіх рублёў уведзены ў абарачэнне з 23 сакавіка, абвясціла прэс-служба Нацыянальнага банка краіны.**

Ахоўны комплекс абноўленых банкнотаў наміналам 20 і 50 рублёў узмоцнены за кошт дадатковага вадзянога знака, больш шырокай ахоўнай ніткі, а для 50 беларускіх рублёў яшчэ і выявы з колерапераменным эфектам.



У дызайн гэтых купюр, у параўнанні з ранейшымі банкнотамі наміналам 20 і 50 беларускіх рублёў унесены наступныя змены:

— выключаны рэквізіт «Старшыня Праўлення» і факсіміле подпісу;

— прыведзены ў адпаведнасць з актуальным знешнім выглядам малюнкі архітэктурных збудаванняў на пярэдніх баках банкнотаў і пазначаны іх назвы;

— замест «2009» паказаны год выпуску ў абарачэнне — «2020»;

— надпіс «пяцьдзесят» на банкноце наміналам 50 рублёў заменены на «пяцьдзясят».

Трэба адзначыць, што банкноты ўзору 2009 года наміналам 20 і 50 беларускіх рублёў, выпушчаныя ў абарачэнне ў 2016 годзе, застаюцца законным плацежным сродкам нашай краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Прыгадаць на гадзіну пра Зямлю

**Мінпрыроды заклікае далучыцца да акцыі «Гадзіна Зямлі — 2020» і прапануе адключыць святло 28 сакавіка на адну гадзіну з 20.30 да 21.30.**

У гэты дзень пад эгідай Сусветнага фонду дзікай прыроды ва ўсім свеце ўжо 14-ы раз пройдзе адна з самых вядомых экалагічных акцый — «Гадзіна Зямлі», якая прыцягвае ўвагу да асцярожнага і адказнага стаўлення да прыроды і рэсурсаў планеты. У ёй бярэ ўдзел больш за два мільярды чалавек па ўсім свеце ў 188 краінах.

У Беларусі акцыя пройдзе 12-ы раз. Напрыклад, у 2018-2019 гадах у Мінску адключалася святло ў такіх будынках, як Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, Беларуская дзяржаўная філармонія, Нацыянальны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, ЦУМ, ГЦ «Сталіца», гасцініца «Беларусь» і іншыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Грошы на каранціне

І кожная партыя наяўных «адлежваецца» не менш за 14 дзён

**У прэс-службе фінансавага рэгулятара расказалі, што цяпер «уся грашовая наяўнасць, якая паступае ў Нацыянальны банк, першапачаткова змяшчаецца на 14-дзённы каранцін».**

Пасля каранціну ажыццяўляецца дбайнае сартаванне банкнот і манет па ступені забруджанасці і зносу, пасля якога назад у абарачэнне выдаюцца толькі чыстыя банкноты і манеты, якія не маюць ніякіх пашкоджанняў. Банкноты нізкіх наміналаў (5 і 10 рублёў) у зварот выдаюцца пераважна новыя, якія раней не былі ў абарачэнні. «Пры гэтым варта ўлічваць, што колькасць грашовай наяўнасці, якая выпускаецца з Нацыянальнага банка штомесяц, складае невялікую долю ад усёй наяўнасці, якая знаходзіцца ў абароце (у касах банкаў, на руках у фізічных асоб, у касах юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых)», — растлумачылі ў Нацбанку.

Спецыялісты галоўнага банка краіны звяртаюць увагу на тое, што пасля кантакту нават з візуальна чыстымі банкнотамі і манетамі неабходна выконваць традыцыйныя правілы гігіены. А найбольш бяспечным з'яўляецца выкарыстанне бескантактавых плацяжоў і дыстанцыйных каналаў банкаўскага абслугоўвання», — адзначаюць у Нацбанку.

Многія камерцыйныя банкі краіны звярнуліся з заклікам да суграмадзян пазбягаць чэргаў у банках і ўстрымацца ад выкарыстання наяўных грошай.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Здалі... супрацьтанкавую стрэльбу

**Пра гэтую незвычайную знаходку паведаміла УУС Брэсцкага аблвыканкама.**

Падчас правядзення растлумачальнай гутаркі з насельніцтвам пра небяспеку, якую тоіць у сабе незаконнае захоўванне зброі, да супрацоўніка міліцыі звярнулася мясцовая жыхарка з заявай аб тым, што ў вёсцы Грушаўка на яе падворку закапаны рарытэтны экзэмпляр стрэльбы.

Праваахоўнікі, якія прыбылі на месца знаходжання схованкі, праваахоўнікі выявілі процітанкавую стрэльбу часоў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая агнястрэльная ручная зброя, якая характарызуецца вялікай дульнай энергіяй кулі, прызначалася для паражэння танкаў праціўніка, іншай браніраванай і небраніраванай тэхнікі, а таксама жывой сілы ў абаронечых збудаваннях рознага тыпу, у тым ліку на даволі значнай адлегласці. У апошняй якасці найбольшае прымяненне яна атрымала ў канцы вайны, калі савецкія байцы выкарыстоўвалі супрацьтанкавую стрэльбу фактычна ў якасці буйнакаліберная снайперскай вінтоўкі.

## Элітны алкаголь — замест зарплаты

**Грузчык скраў яго ў краме, таму што яму мала плацілі.**

Супрацоўнікам аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі палацкай міліцыі днямі давялося кінуць сілы на пошук скрадзенага элітнага алкаголю, паведамляе МУС. 27 бутэлек спіртнога знаходзіліся на складзе прадуктовай крамы і чакалі адгрузкі на прылаўкі. Пакупнікі іх так і не ўбачылі — злодзей забраў выпіўку проста ў скрынях.

Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі кола магчымых датычных да крадзяжу людзей і адразу зразумелі — выкрадальнік, відавочна, са «сваіх». Дасведчаны злодзей арудаваў менавіта ў тым месцы, дзе агляд камер відэаназірання быў недаступны. У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аператыўнікі выйшлі на грузчыка крамы. На відэазапісах бачна, як той заходзіць у памяшканне склада і пасля прыборкі выходзіць. Аднак у пакеце, які мужчына выносіць на плячах, зразумела, не смецце.

Высветлілася, што напярэдадні грузчык скардзіўся прыяцелям на нізкую зарплату, а пасля крадзяжу прапанаваў знаёмым купіць алкаголь па нізкай цане. Аператыўнікі ўстанавілі ўсіх пакупнікоў, але «выратаваць» атрымалася толькі 11 бутэлек. У ходзе апытання мужчына расказаў, што не хапала грошай на аплату крэдыту, таму вырашыў падзарабіць.

Матэрыялы праверкі накіравалі следчым, якія распачалі крымінальную справу за крадзеж. Мужчына павінен пакрыць краме шкоду ў суме каля 650 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**